# Бірукоў Віктар
# (1956-2021)



Бірукоў Віктар Мікалаевіч — журналіст, публіцыст, паэт.

Нарадзіўся ў вёсцы Бук Талачынскага раёна Віцебскай вобласці, у сям'і сялян. З ранніх гадоў Віктар Бірукоў чытаў і трывала запамінаў вершы рускіх і беларускіх паэтаў. А ў 15 гадоў паспрабаваў сам пісаць вершы.

Скончыў філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. З 1977 года працаваў у Талачынскім раёне настаўнікам русскай мовы і літаратуры. Тры гады працаваў дырэктарам Навасельскай васьмігадовай школы. З 1983 па 1991 год — на партыйнай рабоце. Быў загадчыкам грамадска-палітычнага цэнтра ў райкаме, другім скратаром райкама. Але надоўга на гэтай пасадзе не застаўся і вярнуўся выкладаць сваю любімую літаратуру ў Азерацкай базавай школе. З З 1998 года працаваў ў рэдакцыі раённай газеты, а з 2001 па 2020 гады – галоўны рэдактар установы "Рэдакцыя Талачынскай раённай газеты "Наша Талачыншчына". У гэтыя гады раённая газета стала адной з рэнтабельных у Віцебскай вобласці. У 2015 годзе рэдакцыя атрымала званне лепшай ў Віцебскай вобласці. У апошнія гады працаваў журналістам раённай газеты "Наша Талачыншчына".

У 2020 годзе па выніках творчага конкурсу на лепшы матэрыял у сродках масавай інфармацыі аб дзейнасці органаў унутраных спраў Віцебшчыны ў намінацыі "За цеснае і плённае супрацоўніцтва" установа "Рэдакцыя раённай газеты "Наша Талачыншчына", атрымала ўзнагароду (галоўны рэдактар Бірукоў Віктар Мікалаевіч).

У сваіх матэрыялах Бірукоў В.М. падымаў злабадзённыя пытанні розных бакоў жыцця раёна. Многа і таленавіта пісаў пра лепшых людзей, ветэранаў, гісторыю роднага краю, прыроду. Крытычным матэрыялам журналіста характэрна прынцыповасць і ў той жа час карэктнасць і сціпласць. Аўтар больш 390 артыкулаў. Друкаваўся ў мясцовай газеце "Наша Талачыншчына", абласной газеце "Витебские вести", рэспубліканскай "Советская Белоруссия" і іншых. Адзначаны Таварыствам беларускай мовы за актыўнае выкарыстоўванне беларускай мовы ў друку.

Пераможца рэспубліканскага конкурсу "Залатое пяро" ў намінацыі "За значны ўклад у развіццё рэгіянальнай журналістыкі". Узнагароджаны Ганаровай грамата Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь ў 2014 год і нагрудным знакам Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь "Выдатнік друку Беларусі" у 2016 годзе.

Пісаў вершы, быў членам паэтычнай гасцёўні "Друць" пры Талачынскім цэнтры культуры. У сваіх вершах Віктар Бірукоў прызнаваўся ў любові да роднага краю, да зямлі свайго маленства, да землякоў. "Ціхая рачулка на радзіме…", "На радзіме маёй ёсць куточак такі…", "Ліст пажоўклы…", "Бульбяное за ростанню поле…", "Мой горад, мая надзея", "Талачын", "Друць! Ты пачатак мой", "Землякам-талачынцам", "Малітва аб маці", — гэта далёка не поўны спіс вершаў В.М. Бірукова.

Памёр Віктар Мікалаевіч Бірукоў 26.10.2021 года. Пахаваны на радзіме.

# Спіс артыкулаў Віктра Бірукова:


1. **Бруіцца памяці крыніца** / Віктар Бірукоў // Сцяг Ільіча. — 1999. — № 29. — С. 2.
2. **Будущее — за нравственностью** : [Духовность] / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2002. — № 66. — С.2.
3. **Вобраз будучыні не адмаўляе веры**: [Духоўнасць] / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2002. — № 36. — С.1.
4. **Вялікі чалавек і мастак** : [Пра народнага мастака Беларусі, Героя Беларусі Міхаіла Андрэевіча Савіцкага] / Віктар Бірукоў // Віцебскі рабочы. — 2007. — № 12. — С.1, 2.
5. **Вяртанне** : [Духоўнасць] / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2001. — № 46. — С. 2.
6. **Да песні, музыкі з любоўю** / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2002. — № 86. — С. 2.
7. **Дарогі, дарогі, вы так маўклівы, вы так строгі** / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2002. — №91. — С.2.
8. **З Анісенкам ніколі не сумна** : [Нашы знакамітыя землякі] / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2006. — №3. — С. 1.
9. **Званы дабрыні і надзеі** : [Духоўнасць] / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2002. — № 100. — С. 2.
10. **Калі не згасае святло прыгажосці** / Віктар Бірукоў // Сцяг Ільіча. — 1999. — № 48. — С.2.
11. **Мясціны тут — вачэй не адвесці** / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2002. — № 23. — С.2.
12. **Нашай малой радзіме ёсць кім ганарыцца** / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2019. — № 30. — С. 4.
13. **Першае слова — Талачыншчыне** : [Культурнае жыццё раёна] / Віктар Бірукоў // Сцяг Ільіча. — 1999. — № 9. — С. 2.
14. **Прыцягальнасць душы Лявона Баразны** : [Пра мастака Лявона Баразну] / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2002. — № 67. — С.1.
15. **Слаўны сын зямлі талачынскай** : [Пра народнага мастака Беларусі, Героя Беларусі Міхаіла Андрэевіча Савіцкага] / Віктар Бірукоў // Наша Талачыншчына. — 2007. — № 12. — С.1.
16. **Сцяжынкі новых адкрыццяў** : [Друцк] / Віктар Бірукоў // Сцяг Ільіча. — 2000. — № 31. — С. 4.
17. **Творчасць не ведае ўзросту** : [Пра мясцовага краязнаўцу Анатоля Антонавіча Шнэйдара] / Віктар Бірукоў // Сцяг Ільіча. — 2000. — №82. — С.2,4.


## Дадатковы матэрыял
## аб жыцці і дзейнасці:


1. **Бірукоў Віктар Мікалаевіч**, журналіст // Півавар, М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы ХХ — пачатку ХХІст. : бібліяграфічны даведнік / М.В. Півавар. — Мінск : Кнігазбор, 2010. — С. 36.